# У ДАПАМОГУ НАСТАЎНІКАМ

Настаўнікі мастацтва Першамайскага раёна горада Віцебска напрыканцы снежня абмяркоўвалі пытанні павышэння прафесійнай кампетэнтнасці педагогаў па прадмеце «Мастацтва (айчынная і сусветная мастацкая культура)». Пляцоўкай для правядзення семінара, ініцыятарам якога выступіла сярэдняя школа № 25 г. Віцебска, стаў мастацка-графічны факультэт нашага ўніверсітэта. І гэта невыпадкова, бо менавіта ў нас рыхтуюць кадры для школ горада і вобласці і многія настаўнікі выяўленчага мастацтва, працы і мастацтва, якія працуюць сёння ў розных установах адукацыі, з'яўляюцца нашымі выпускнікамі.

У рабоце семінара прынялі ўдзел прадстаўнікі МГФ, метадыст дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі дарослых «Віцебскі абласны інстытут развіцця адукацыі» В.У. Пікулік, метадыст аддзела адукацыі, спорту і турызму адміністрацыі Першамайскага раёна г. Віцебска М.А. Сакірнік, кіраўнік метадычнага аб'яднання настаўнікаў выяўленчага мастацтва Першамайскага раёна г. Віцебска Р.М. Пліско, а таксама настаўнікі 22 школ раёна.

Падчас пасяджэння былі разгледжаны пытанні вучэбна-метадычнага забеспячэння адукацыйнага працэсу па прадмеце «Мастацтва». Удзельнікі семінара пазнаёміліся з прыярытэтнымі накірункамі дзейнасці мастацка-графічнага факультэта і метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па арганізацыі адукацыйнага працэсу па мастацтве, абмяняліся вопытам выкладання новага вучэбнага прадмета, намецілі шляхі супрацоўніцтва факультэта і Віцебскага абласнога інстытута развіцця адукацыі ў галіне выкладання мастацтва і г.д.

Было прынята таксама рашэнне аб стварэнні вучэбна-метадычнага дапаможніка для настаўнікаў мастацтва, куды б увайшлі лепшыя метадычныя распрацоўкі педагогаў раёна.

Акрамя гэтага, у межах работы семінара адбыліся прэзентацыі метадычнага відэаматэрыялу ў дапамогу выкладання прадмета і выстава малюнкаў навучэнцаў сярэдняй школы № 25, якая праходзіла ў той час на факультэце.

На выставе «В каждом рисунке – солнце», якая адкрылася ў выставачнай зале МГФ напярэдадні Новага года, было прадстаўлена каля пяцідзесяці работ навучэнцаў – пераможцаў разнастайных конкурсаў. Прэзентавала экспазіцыю настаўніца мастацтва гэтай школы, выпускніца нашага ўніверсітэта В.У. Дарожка.

Напрыканцы сустрэчы гасцей факультэта чакалі экскурсія па музеі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, майстэрнях мастацка-графічнага факультэта і майстар-клас па кераміцы, які праводзіла майстар вытворчага навучання С.М. Кацуба.

**Д.С. СЯНЬКО,**
**дацэнт кафедры**
**выяўленчага мастацтва.**